№№71–72
(2799–2800)

15 мая 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

Шушкевіч атрымаў голуба

Былы польскі прэзідэнт Лех ВАЛЕНСА ўручыў беларускаму палітыку і навукоўцу Станіславу ШУШКЕВІЧУ пераходную ўзнагароду за заслугі ў барацьбе за правы чалавека — статуэтку голуба.

Сам Валенса атрымаў гэтую ўзнагароду ад былога прэм'ера Польшчы Ежы Бузека, а той — ад старшыні Еўрапарламента Ганса-Герта Поэтэрынга.

Пры ўручэнні статуэткі Валенса патлумачыў свой выбар тым, што свет павінен ведаць Шушкевіча, які браў вялікі ўдзел у спыненні існавання СССР. Станіслаў Шушкевіч, прымаючы статуэтку, якая перад ім была таксама ў Папы Рымскага Бенедыкта XVI і тыбецкага лідэра Далай-Ламы, зазначыў, што для яго гэта вялікі гонар.

ПАЛІТКУХНЯ

Зміцер БАНДАРЭНКА:

«Адказ на рэпрэсіі — байкот»

"Улады паставілі на дыялогу і дэмакратызацыі крыж, развязаўшы сапраўдны тэрор супраць палітычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці. Таму дэмакратычныя сілы мусяць пачаць рэалізацыю іншай стратэгіі", — лічыць каардынатар Хартыі'97 Зміцер БАНДАРЭНКА.

— Вы былі адным з ініцыятараў дыялогу апазіцыі з уладамі. Ці мела сэнс гэтая ініцыятыва, калі палітвязні па-ранейшаму ў турме, мірныя акцыі жорстка разганяюцца, Лукашэнка публічна абражае дэмакратаў па тэлебачанні?

— Сэнс мела, але сёння вы маеце рацыю: надышоў час і апазіцыі адмовіцца ад дыялогу. Нагадаю, што ў пачатку 2007 года Беларусь апынулася на мяжы эканамічнай катастрофы пасля рашэння Расіі рэзка ўзняць кошты на газ і нафту, што пастаўляюцца ў нашу краіну. Узнікла пагроза страты незалежнасці. У гэтых умовах апазіцыя цалкам свядома працягнула руку дапамогі беларускім уладам. І што б ні казаў сёння Лукашэнка, прапанова дыялогу з боку дэмакратычных сіл паспрыяла рэалізацыі ў Беларусі шэрагу інвестыцыйных праектаў, значна ўзмацніла пазіцыі краіны на перамовах з Расійскай Федэрацыяй, дазволіла адкрыць новыя крэдытныя лініі ў Еўропе. Бо адна справа мець зносіны з апошняй дыктатурай Еўропы, і іншая — з уладамі, якія абвясцілі пачатак дэмакратызацыі, гатоўнасць весці дыялог са сваёй апазіцыяй і пачатак дыялогу з Захадам. Ну а тое, што кіраўнік дзяржавы публічна ўжывае такія словы, як "вшивый", "шелудивый", "отморозок", дык ён такім чынам прылеплівае гэтыя эпітэты да сябе, дэманструючы агрэсіўнасць і не надта добрае выхаванне.

— Апазіцыя канчаткова адмаўляецца ад дыялогу з уладамі?

— Дыялог адкрываў цалкам новыя магчымасці для краіны. Падчас сваіх міжнародных візітаў прадстаўнікі апазіцыі казалі: у выпадку вызвалення ўсіх палітвязняў, і ЗША, і еўрапейскія краіны мусяць зрабіць крокі насустрач беларускім уладам. Нядаўна ў Вашынгтоне мы абмяркоўвалі з высокімі прадстаўнікамі Дзярждэпартамента магчымасць візіту міністра замежных спраў Беларусі і прадстаўніка Адміністрацыі Лукашэнкі ў ЗША. Амерыка сапраўды была гатова да рэальнага прарыву ў адносінах з нашай краінай, вялася размова пра гатоўнасць сур'ёзна паспрыяць у рашэнні энергетычных праблем Беларусі.

Калі б беларускія ўлады вызвалілі Аляксандра Казуліна да канца лютага, як і абяцалі амерыканскім і еўрапейскім палітыкам, то з 1 сакавіка мы б жылі ў новай Беларусі. Аднак Аляксандр Рыгоравіч прыняў бок тых сваіх паплечнікаў, якія ніякім чынам не бачаць сябе ў дэмакратычнай, еўрапейскай Беларусі.

Апазіцыя будзе зноў гатова да дыялогу ў выпадку рэальных крокаў улады па дэмакратызацыі краіны.

Пакуль жа ўлады паставілі на дыялогу і дэмакратызацыі крыж, развязаўшы сапраўдны тэрор супраць палітычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці. Таму дэмакратычныя сілы мусяць пачаць рэалізацыю іншай стратэгіі.

— Якой можа быць новая стратэгія апазіцыі?

— Новая стратэгія сёння — гэта цвёрдае супрацьстаянне дыктатуры ва ўсіх кірунках. Ва ўмовах, калі ніякай лібералізацыі не адбываецца, немагчыма спадзявацца, што хуткія выбары ў "парламент" будуць дэмакратычнымі і вольнымі, таму на павестку дня ўстаюць лозунгі "Байкот выбарчаму фарсу!", "Байкот рэжыму Лукашэнкі!", "Байкот дыктатуры!". Улады самі падштурхнулі апазіцыю да змены падыходаў.

— Што можа даць байкот выбараў? Партыі заяўляюць, што выбарчая кампанія дае дэмакратам дадатковую магчымасць для інфармавання насельніцтва Беларусі пра сітуацыю ў краіне.

— У гісторыі ёсць выпадкі, калі паспяхова здзейсненыя байкоты прымушалі ўлады ісці на значныя саступкі на наступных выбарах. Значна горш — байкот непадрыхтаваны. Так, беларуская апазіцыя выкарыстала частковы байкот на мясцовых выбарах у 1999-м і 2007 годзе. Неэфектыўна рабіць заявы пра байкот выбараў за некалькі дзён да галасавання. Такія кампаніі насамрэч прыводзяць да дэпрэсіі ў грамадстве і адцёку актывістаў. Байкот жа выбараў 2000 года ў значнай ступені кансалідаваў дэмакратычныя сілы, спрыяў значнаму прыходу моладзі ("Зубр", "Малады фронт"). Думаю, ніхто не стане спрачацца, што параза на прэзідэнцкіх выбарах 2001 года была звязана са слабасцю і пасіўнасцю вылучаных апазіцыяй кандыдатаў. Усе моцныя кандыдаты альбо не мелі права ўдзельнічаць у выбарах з-за турэмнага зняволення, альбо былі забітыя.

Байкот-2008 таксама стане перашкодай намерам у чарговы раз сумясціць выбары з рэферэндумам. Напрыклад, аб Канстытуцыйным акце аб'яднання з Расіяй.

— Але ўсё роўна людзей будуць заганяць на датэрміновае галасаванне. Які можа быць байкот у такіх умовах?

— У пытанні змяшчаецца і адказ. Усе ведаюць, што датэрміновае галасаванне выкарыстоўваецца дыктатарскімі рэжымамі для масавых фальсіфікацый. У нармалёвых умовах, у тым ліку на выбарах 90-х гадоў у Беларусі, у датэрміновым галасаванні бярэ ўдзел 3—5 працэнтаў выбаршчыкаў. Таму неабходна наладзіць кантроль за колькасцю тых, хто прагаласаваў менавіта ў асноўны дзень галасавання. Я думаю, гэта цалкам па сілах і замежным, і беларускім дэмакратычным назіральнікам. Хацеў бы нагадаць, што ў 2000 годзе, адразу пасля так званых выбараў, БТ пераказала, што выбары не адбыліся ні ў адным з абласных гарадоў і ў Мінску з-за нізкай яўкі. І толькі праз некалькі гадзін улады пачалі адкручваць, але ў трэці гарадскіх округ давялося ладзіць паўторныя выбары. Нават у Магілёве адбыўся другі тур. Баявы дух апазіцыі пасля кампаніі байкоту быў вельмі высокі.

— Гэта значыць, вы не спадзеяцеся, што ўлады пойдуць на правядзенне дэмакратычных выбараў пасля таго, як кіраўнік ЦВК Лідзія Ярмошына ўжо заявіла, што прапановы апазіцыі аб кантролі над падлікам галасоў незалежнымі назіральнікамі "невыканальныя"?

— Я думаю, усё стане канчаткова ясна ў сярэдзіне чэрвеня. І з гэтага часу можна будзе пачынаць кампанію байкоту сіламі грамадзянскай супольнасці. Партыі на першым этапе паспрабуюць скарыстаць магчымасці выбарчай кампаніі для прасоўвання сваіх ідэй, але, сутыкнуўшыся з чарговай "гульнёй без правіл", далучацца да байкоту. Магчыма, не ўсе адразу падтрымаюць байкот, але, у рэшце рэшт, да яго далучыцца абсалютная большасць дэмакратычных структур.

— Ці не азначае гэта, што пасля аб'явы байкоту рэпрэсіі будуць узмоцнены?

— Байкот з'яўляецца адказам на рэпрэсіі. Да таго ж рэакцыяй на ціск улад мусіць стаць значнае ўзмацненне кампаніі салідарнасці як у краіне, так і за межамі.

— Калі апазіцыя прапаноўвала ўладам дыялог, вялося, што гэта перадусім "пасланне для чыноўнікаў". Што рабіць тым з іх, хто хацеў дыялогу?

— Думаю, што згортванне дыялогу з апазіцыяй, і апазіцыі з Захадам, стала для многіх чыноўнікаў шокам. Падчас шматлікіх кантактаў беларускіх дэмакратаў з дзяржслужачымі, як санкцыянаваных "зверху", так і неафіцыйных, мы яшчэ раз пераканаліся, што абсалютная большасць гэтых людзей жадае пазітыўных змен і звязвае свае інтарэсы з новай дэмакратычнай Беларуссю, з Еўропай. Цяпер чыноўнікі вымушаны зноў слухаць з экранаў тэлевізараў гісторыі пра выкрыццё чарговай "групы карупцыянераў". Але думаю, новае зацісканне гаек доўгім не будзе. У дыктатуры папросту няма для гэтага рэсурсаў. Форму байкоту дыктатуры кожны можа вызначаць сам. Гэта дапаможа рэальнаму аб'яднанню ўсіх нармалёвых людзей як ва ўладзе, так і ў апазіцыі. Ужо ўсім бачна, што даўно чаканым зменам у краіне перашкаджае вельмі і вельмі маленькая група людзей. І калі яны адказалі на дыялог новымі арыштамі і адштурхнулі працягнутую руку, то нам усім нічога не застаецца, як прыняць выклік. Яны самі пачалі канфрантацыю.

Хартыя'97

ЧУЛІ?

Супраць Аляксея Марачкіна распачалі адміністрацыйную справу

Вядомаму мастаку, старшыні Міжнароднай арганізацыі "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" Аляксею Марачкіну пагражае адміністрацыйная адказнасць за карціну, напісаную 11 гадоў таму.

Нагадаем, што напярэдадні Дня Волі ў майстэрню да мастака прыйшлі міліцыянты. Яны канфіскавалі плакаты, прымеркаваныя да шэсця, а таксама забралі вядомую карціну "Лялькі". Пасля таго інцыдэнту Аляксея Антонавіча кінулі "на суткі" — нібыта за нецэнзурную лаянку.

І вось днямі Марачкін быў выкліканы ў Цэнтральны РУУС Мінска, дзе даведаўся, што супраць яго ўзбуджана адміністрацыйная справа: "Допыт праводзіў старшы лейтэнант Д.П.Курыльчык, — гаворыць Марачкін. — Яны сфатаграфавалі ўсе канфіскаваныя напярэдадні Дня Волі расцяжкі, а таксама карціну "Лялькі", на якой, паводле міліцэйскага пратаколу, "изображено 10 мужских фигур". У сваю чаргу я распавёў, што рыхтаваў плакаты да дазволенага ўладамі шэсця. Але, што самае дзіўнае, міліцыянты падчас ператрусу канфіскавалі і расцяжкі ранейшых гадоў — з маёй асабістай калекцыі, якія да мінулага Дня Волі не прызначаліся".

Але найвялікшую цікавасць у "стражей порядка" выклікала вядомая карціна Марачкіна "Лялькі". "Гэты твор напісаны мною яшчэ напрыканцы мінулага стагоддзя, — працягвае Аляксей Антонавіч. — На ягонае напісанне мяне натхніла вядомая тэлеперадача расійскага тэлеканала НТБ "Лялькі". У міліцыі мне сказалі, што ў хуткім часе распачнецца экспертыза канфіскаваных плакатаў і "Лялек". Ці то ў жарт, ці то ўсур'ёз мне паведамілі, што экспертыза будзе праводзіцца ў будынку РУУС. Я параіў міліцыянтам прыцягнуць для правядзення экспертызы прафесійных мастакоў. На што мне было сказана: "Нікога з вашага саюза мы браць не будзем, у нас свае спецыялісты ёсць". І ў выпадку, калі экспертыза вывяліць, што галоўны герой карціны падобны на самага высокага беларускага начальніка, мяне, магчыма, абвінавацяць у знявазе".

Сам мастак каменціруе сітуацыю наступным чынам: "Гэта смех на ўвесь свет! Прыцягваць да адказнасці за карціну, якая выстаўлялася ў Палацы мастацтва, гэта проста абсурдна. Выява гэтай карціны друкавалася ў многіх газетах і раней нараканняў ні ў кога не выклікала, а вось зараз вырашылі прычапіцца менавіта да яе..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЧУЛІ?

Трэнер расійскіх гімнастак прыляціць у Мінск на асабістым самалёце

Як паведаміла галоўны трэнер беларускай зборнай па мастацкай гімнастыцы Ірына Лепарская, галоўны трэнер расійскіх гімнастак Ірына Вінер прыляціць у Мінск на этап Кубка свету BelSwissBank разам з чатырма гімнасткамі на асабістым самалёце.

Зрэшты, Ірына Аляксандраўна, напэўна, можа сабе гэта дазволіць. Яе муж, мільярдэр Алішэр Усманаў, зараз узначальвае "Газпроминвестхолдинг", а наогул атрымаў шырокую вядомасць як прадпрымальнік, які дапамог "Газпрому" вярнуць выведзеныя ў 1990-х актывы. Да гэтага часу Усманаў займаецца ўрэгуляваннем шматмільярдных пазыкаў газавай манаполіі.

У верасні 2007 года Усманаў набыў на аўкцыёне "Сотбіс" усю калекцыю Растраповіча і Вішнеўскай за "суму, якая не агалошваецца, аднак якая значна перавышае ўсе чаканні".

Дарэчы, Алішэр Усманаў і сам добра знаёмы са спортам. У свой час ён выступаў за зборную СССР па фехтаванні, у 2005 годзе быў абраны прэзідэнтам Еўрапейскай канфедэрацыі фехтавання.

...А расійскай зборнай па мастацкай гімнастыцы можна толькі пазайздросціць. Не кожная каманда лятае на спаборніцтвы на асабістых самалётах.

Алесь СІВЫ.

РОЗДУМ НАД ФАКТАМ

Далёка нам да вострава Шры Ланка

Рэктар Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта Валерый Дзяйкола не хавае задавальнення: ягоная навучальная ўстанова выйшла на новы ўзровень міжнароднага супрацоўніцтва. Гэтаму спрыяе новы навучальна-камерцыйны праект, які прадугледжвае стварэнне на востраве Шры Ланка ў Індыйскім акіяне, дзе знаходзіцца аднайменная дзяржава, падрыхтоўчага аддзялення ВДМУ. Рэальнасць гэтай перспектывы пацвердзіў у час нядаўняга візіту ў медуніверсітэт прэм'ер-міністр адной з правінцый у рэспубліцы Шры Ланка.

Кожнае прыбаўленне студэнтаў з далёкага вострава ў ВДМУ гарантуе універсітэту прыкметны рост валютнай часткі бюджэту. Не дзіўна, што кіраўніка ланкійскай правінцыі Сабарагавума спадара Махіпалу Херата адміністрацыя ВДМУ прымала, як прэзідэнта буйной еўрапейскай краіны, а тое, што госць пацвердзіў свой намер адкрыць у правінцыі падрыхтоўчае аддзяленне медуніверсітэта, выклікала захапленне кіраўнікоў ВДМУ. На гэтым аддзяленні будуць займацца ланкійскія абітурыенты перад паступленнем у віцебскую ВНУ. У праграме аддзялення чатыры прадметы — руская мова, хімія, фізіка і біялогія.

Раней праз такое падрыхтоўчае аддзяленне моладзь Шры Ланкі, як і ўсе іншыя замежнікі, праходзіла ў Віцебску. Цяпер большую частку лекцый для слухачоў на востраве будуць таксама чытаць віцебскія выкладчыкі, але не ў далёкім беларускім горадзе, а непасрэдна ў рэспубліцы Шры Ланка. Зразумела, падарожжа на востраў, які не так даўно ўсе ведалі як Цэйлон, запатрабуе немалых фінансавых выдаткаў, але ўлады Шры Ланкі, зацікаўленыя ў аздараўленні свайго насельніцтва, гатовыя аддаць долю бюджэту на авіябілеты для віцебскіх педагогаў і на ўтрыманне беларусаў за мяжой.

Аддзяленне ВДМУ ў рэспубліцы Шры Ланка — першае замежнае прадстаўніцтва беларускай сістэмы медыцынскай адукацыі. Іншыя медуніверсітэты нашай краіны пакуль што не абзавяліся замежнымі філіяламі.

Стварэнне падрыхтоўчага аддзялення ў замежжы — справа прэстыжная і выгадная, бо гарантуе павелічэнне колькасці студэнтаў-іншаземцаў, а ў выніку — рост валютных паступленняў у казну дзяржавы і ў бюджэт навучальнай установы. На пачатак бягучага года сярод студэнтаў ВДМУ налічвалася 566 замежнікаў з 24 краін. Кожны з іх аддае каля 3,5 тысячы долараў ЗША за год навучання, ведаючы, што гэтыя выдаткі акупяцца высокімі заробкамі дыпламаванага ўрача.

Ланкійцаў у ВДМУ заўсёды было нашмат болей за студэнтаў з іншых краін. Сёння іх у медуніверсітэце каля 130.

Нарошчванне колькасці іншаземцаў у ВДМУ можна было б толькі вітаць, але не дае спакою думка пра адну акалічнасць. Трэба адзначыць, што з віцебскага медуніверсітэта штогод выходзіць шмат кваліфікаваных урачоў, у лячэбных і — асабліва — паліклінічных установах Віцебшчыны востра не хапае медыцынскіх спецыялістаў розных профіляў — ад тэрапеўтаў да гінеколагаў. Ды і тыя, што ёсць, на месцы доўга не затрымліваюцца, бо не задаволены нізкай зарплатай і празмернай нагрузкай, асабліва — велізарнымі выдаткамі часу на фармальную пісаніну, з-за якой і скарачаецца час непасрэдных стасункаў з хворымі. Недахоп урачоў дайшоў да таго, што ў бальніцах і паліклініках працуюць 70-гадовыя пенсіянеры.

"Трэба найперш лячыць не хваробу, а душу пацыента", — заклікалі сваіх калег славутыя ўрачы мінуўшчыны.

"Як можна выканаць гэты заклік, калі на прыём хворага ў паліклініцы афіцыйна адводзіцца 12 хвілін?" — ставяць пытанне рубам цяперашнія ўрачы Віцебска, дзе таксама адчуваецца дэфіцыт медыцынскіх кадраў. Прыкладам амаль катастрафічнага іх недахопу можна лічыць гарадскую паліклініку №4, якая абслугоўвае ў асноўным цэнтральную, найбольш населеную частку абласнога цэнтра. Тут няма акуліста, эндакрынолага, не хапае іншых спецыялістаў. На ўчастку №2 каля года няма пастаяннага тэрапеўта і па выкліках на дом ходзяць па чарзе розныя ўрачы. Няма змены ў такога "папулярнага" спецыяліста, як уролаг. З-за гэтага дасведчаны Міхаіл Бром вымушаны працаваць за дваіх, прымаючы за змену замест 30-ці па 40—45 пацыентаў. Урач з 40-гадовай практыкай, Бром атрымлівае 500 тысяч у месяц. Гэта — пры тым, што ён, акрамя прыёму хворых, робіць у паліклініцы аперацыі, выязджае на дом па выкліках асобных хворых.

Штогод шмат спрактыкаваных урачоў пакідаюць Віцебшчыну і знаходзяць працу і прыстойныя заробкі ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, краінах Балтыі і далёкага замежжа.

Не хапае ў Віцебску і вобласці не толькі ўрачоў, а і медыцынскага абсталявання, у тым ліку — дыягнастычнага, для набыцця якога нестае грошай. А з таго часу, як сотні пацыентаў з Віцебскага раёна былі перададзены на абслугоўванне медустановам абласнога цэнтра, ускраінныя бальніцы Віцебска перагружаны да такой ступені, што хворых трымаюць не ў палатах, а ў калідоры. Вось і ўзнікае пытанне: а ці не лепш было б скіраваць больш увагі і сродкаў на падрыхтоўку ўрачоў з ліку суайчыннікаў, узняць на большую вышыню ўмовы і аплату працы нашых урачоў замест таго, каб аддаваць сілы, веды і грошы навучанню медыкаў для далёкіх краін? Бо атрымліваецца, што прыярытэтам дзяржаўнай улады Беларусі з'яўляецца здароўе не нашага народу, а насельніцтва краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, урады якіх згодныя шчодра плаціць за дасканалае медыцынскае абслугоўванне сваіх грамадзян...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЗАПРАШЭННЕ

У гонар «Еўраслоўніка» і яго аўтара

20 мая на сядзібе Партыі БНФ (пр.Машэрава, 8) адбудзецца прэзентацыя **"Еўраслоўніка" Лявона Баршчэўскага**. Удзел бяруць аўтар, а таксама Уладзімір Сіўчыкаў, Адам Мальдзіс, Франак Вячорка і іншыя.

Перад гасцямі выступіць калектыў "Менск-стар квартэт" з праграмай еўрапейскай класічнай музыкі.

Пачатак а 19-й гадзіне.

Не ляжаць жа на канапе

Як высветліла "Народная воля", у апазіцыйных шэрагах няма адзінадушша наконт мэтазгоднасці ўдзелу ў выбарчай кампаніі. Адны збіраюцца ісці на выбары, другія — не.

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА** лічыць, што ўдзельнічаць у выбарах трэба.

— Быў час абмяркоўваць, а зараз надышоў час працаваць, — гаворыць Лябедзька. — Тэма ўдзелу ці няўдзелу ў выбарах абмяркоўвалася яшчэ ўлетку 2007 года, а восенню ў межах АДС адбыўся "круглы стол" на гэтую тэму. Тады, узважыўшы ўсе "за" і "супраць", было прынята рашэнне ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі. Большасць актывістаў дэмакратычных партый успрымаюць слова "байкот" літаральна. Яны будуць ляжаць на канапе і нічога не рабіць. У лепшым выпадку пры байкоце можна скруціць кукіш у кішэні і паказаць яго тэлевізару, па якім паказваюць вядомага персанажа.

Байкот не дазваляе мабілізаваць людзей, з тым каб яны выйшлі на вуліцу і пратэставалі. Гэта я зразумеў пасля ўдзелу ў кампаніі байкоту 2000 года. Але тады сітуацыя была іншая. Зараз, на маю думку выбарчыя камісіі атрымаюць лічбы загадзя...

І тым не менш я заклікаю да актыўнага ўдзелу ў выбарчай кампаніі на ўсіх этапах, за выключэннем этапу галасавання. АДС пакідаюць за сабой права зняць усіх альтэрнатыўных кандыдатаў у дзень галасавання. Я заклікаю дэмакратычных актывістаў працаваць з людзьмі, хадзіць ад дзвярэй да дзвярэй, знаёміць іх з пунктам гледжання, альтэрнатыўным таму, які даводзіць афіцыёз.

Прыкладна так жа лічыць і палітык **Анатоль ЛЯЎКОВІЧ**. Толькі ў адрозненне ад Лябедзькі нават называе тых, хто выступае за байкот, "сапраўднымі правакатарамі":

— Для таго, каб зладзіць байкот, у апазіцыі няма годнага рэсурсу, — упэўнены палітык. — Не змогуць актывісты апазіцыі давесці да 70% выбаршчыкаў, што на выбары ісці не трэба. Таму трэба ваяваць. А на вайне як на вайне — войска не выбіраюць. У дэмакратаў, у адрозненне ад улады, рэсурс абмежаваны, але ісці на выбары трэба.

А тыя, хто заклікае да байкоту, — сапраўдныя правакатары.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

СКАЗАНО!

Александр ЛУКАШЕНКО:

«Да кому ты нужен...»

— Нашли оппозиционера, который набрал полтора процента, сделали его великим политзаключенным... Оппозиция уже не хочет, чтобы его выпускали. Имейте в виду, если он завтра выйдет на свободу, оппозиции не будет. Неужели вы не понимаете, что это за человек. Святого для него нет! Святого нет в этом человеке. Мы знаем, чем дышит оппозиция и чего она хочет. У него была возможность... пятеро политзаключенных этим воспользовались... он отказался. Ему, видите ли, момент не наступил. Нужно, чтобы весь мир выступил за его освобождение, и чтобы вся власть под давлением мира рухнула. Да кому ты нужен..."

(Из ежегодного послания А.Г.Лукашенко к Национальному собранию и белорусскому народу.)

***

Кажется, Александра Козулина вот-вот выпустят на свободу. И для этого есть все предпосылки. Во-первых, как сказал Лукашенко, кому он нужен... Во-вторых, как видно из цитаты, оппозиция не заинтересована в том, чтобы Козулин был на свободе. Значит, нужно назло оппозиции взять да и вытолкнуть тюремного сидельца за железные ворота. В-третьих, одним махом можно сразу двух зайцев убить — показать общественности живого, но, по логике Лукашенко, не представляющего интереса Козулина и в то же время окончательно похоронить оппозицию. Ведь Александр Григорьевич, заметьте, прямо сказал: "Имейте в виду, если он завтра выйдет на свободу, оппозиции не будет". Так что выпускаем Козулина на свободу!!!

МЕРКАВАННІ

У Расіі адбылася змена прэзідэнта. Ці паўплывае гэта на адносіны паміж Беларуссю і Расіяй?

Вінцук Вячорка: *Расійская палітыка ў дачыненні да Беларусі стане больш выразнай*

Першы намеснік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка ўпэўнены, што палітыка Расіі ў дачыненні да Беларусі пасля прыходу да ўлады Дзмітрыя Мядзведзева "не памяняецца, а стане яшчэ больш выразнай".

"Гэта абумоўлена найперш усім вядомымі сувязямі Мядзведзева з "Газпромом", -- кажа Вінцук Вячорка. На яго думку, "Крэмль будзе ўтрымліваць пры ўладзе Беларусі Лукашэнку з раўналежным яго аслабленнем".

Сяргей Калякін: *Дзмітрый Мядзведзеў — самадастатковы прэзідэнт*

Палітыка Мядзведзева ў адносінах да Беларусі будзе больш прагматычнай, чым палітыка Пуціна, мяркуе старшыня Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін.

"Пакуль што ўсе разглядаюць Мядзведзева як пераемніка Пуціна. Я думаю, што гэта будзе самадастатковы прэзідэнт, — кажа С.Калякін. — Ён будзе весці палітыку на пацяпленне адносін Расіі з Еўрасаюзам, стратэгічнае партнёрства з ЗША. І тады ў Беларусі будзе мала магчымасцяў для спекуляцый паміж Захадам і Расіяй".

Анатоль Лябедзька: *Прэс з боку Расіі будзе павялічвацца*

Палітыка Дзмітрыя Мядзведзева ў асноўным "будзе пераемнай, бо ён і Пуцін — прадстаўнікі адной часткі палітычнай эліты, аднак змесцяцца акцэнты ў эканамічнай сферы", — лічыць старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька.

З новым расійскім прэзідэнтам менш будзе палітычнай рыторыкі, але "прэс з боку Расіі будзе павялічвацца, — мяркуе А.Лябедзька. — Пры тым захаваюцца бясплатныя паслугі Крамля для беларускага прэзідэнта ў міжнародных арганізацыях. Грант на энерганосьбіты можа паменшыцца, але застанецца".

Анатоль Ляўковіч: *Крэмль павінен наладжваць стасункі з беларускай апазіцыяй*

Першы намеснік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Ляўковіч мяркуе, што з прыходам да ўлады Дзмітрыя Мядзведзева "для Крамля важна было б наладжваць стасункі не толькі з урадам Беларусі, але і стасункі паміж грамадскімі супольнасцямі Расіі і Беларусі, у прыватнасці з апазіцыяй".

Палітык выказаў сваю думку наконт таго, якім павінен быць палітычны кірунак Беларусі: "Калі ў нас апазіцыя наладжвае стасункі з Захадам, улада ставіцца да гэтага спакойна. А манаполію на ўсходні палітычны вектар трымае Лукашэнка. І маё меркаванне, якога прытрымліваецца большасць сяброў АДС, — гэту манаполію трэба разбураць".

Андрей Суздальцев: *«Сейчас Беларусь для России отошла на второй план»*

Недавно вступил в должность президента России Дмитрий Медведев, сменивший на этом посту Владимира Путина. Сменится ли после этого политика России по отношению к Беларуси? Об этом в беседе с корреспондентом "Народной воли" рассуждает политолог Андрей СУЗДАЛЬЦЕВ.

— Примечательно, что в контексте инаугурации Дмитрия Медведева союзное государство Беларуси и России совсем не присутствовало и не упоминалось, — говорит мой собеседник. — И здесь все просто. Для легитимности российской власти наличие российско-белорусского проекта не является основополагающим. Путин остается у руля исполнительной власти России, и это говорит о том, что будет происходить плавный переход от одной элиты к другой с унаследованием основных идеологических и политических установок периода Путина. То есть, как мне кажется, по крайней мере до конца этого года Россия будет действовать в рамках ныне заключенных соглашений с Беларусью. Какие-то кардинальные изменения в отношениях двух стран можно ожидать только в двух случаях. Если какие-то изменения спровоцирует белорусская сторона. Или же белорусская власть попадет в кризис. Тогда внимание России со стороны его руководства, конечно же, будет усилено.

— Ожидается, что свой первый официальный визит в должности президента Дмитрий Медведев нанесет не в соседнюю Беларусь, а в Казахстан...

— Сейчас у российской власти достаточно других проблем. И в первую очередь — в Центральной Азии, где ситуация близка к дестабилизации. Это будет отвлекать внимание России на постсоветском пространстве от других регионов. Так что Беларусь остается на втором плане.

— На ваш взгляд, Медведев скопирует политику Путина?

— Нет, изменения будут, но не сразу, хотя преемственность будет достаточно высокая. Дело в том, что элитные группы, которые поддерживают Медведева и Путина, близки, пересекаются, но никак не совпадают.

Алесь СИВЫЙ.

«Эль Паис»: *Беларусь хотела поставлять оружие колумбийским повстанцам*

Испанская газета "Эль Паис" со ссылкой на свои источники в колумбийском правительстве пишет о том, что Венесуэла и Беларусь намеревались поставлять оружие для повстанцев из Революционных вооруженных сил Колумбии (FARC).

В материале от 10 мая издание сообщает об электронном письме, найденном в компьютере одного из лидеров боевиков Рауля Рейеса, который был убит 1 марта в результате спецоперации колумбийской армии.

Это зашифрованное сообщение датировано 8 февраля и подписано одним из членов секретариата FARC **Иваном Маркесом**, который сообщает, что Уго Чавес *"рассмотрел с белорусскими властями возможность поставок вооружения". "Наш белорусский друг продолжает работу над пакетом* (возможно, имеется в виду пакет документов. — **Прим. авт.**) *о путях к черному рынку, чтобы решить проблемы, — цитирует газета выдержки из письма. — 17 числа этого месяца* (февраля. — **Прим. авт.**) *в Каракас прибудет делегация высоких представителей от этого друга, чтобы уточнить список. Ангел просил, чтобы мы были здесь и лично договорились с делегацией".*

По данным "Эль Паис", под псевдонимом "Ангел" зашифрован Уго Чавес. *"А друг — это **Виктор Шейман**, госсекретарь Совета безопасности Беларуси, человек из ближайшего круга Александра Лукашенко. Шейман был одним из тех, кто продвигал контракты на поставку оружия в Венесуэлу на сумму в 720 млн евро, которые были подписаны в прошлом году",* — утверждает газета.

Интересно, что 15—19 февраля Венесуэлу с официальным визитом посещала белорусская делегация, возглавлял которую как раз Виктор Шейман.

Но, согласно официальной информации, в ходе визита обсуждались не вопросы поставок оружия, а финансирование проектов строительства в Венесуэле заводов с участием МАЗ, БелАЗ и МТЗ. А также такие "гражданские" проекты, как строительство пяти тысяч квартир и реконструкция в Каракасе района Мирафлорес, создание совместного предприятия по бурению и ремонту нефтяных скважин.

В пресс-центре Государственного секретариата Совета безопасности Беларуси заявили, что обращать внимание на всякие домыслы, к распространению которых подключилась испанская пресса, несерьезно. Там также отметили, что недавно президент Венесуэлы Уго Чавес предупреждал о том, что США организуют вброс в СМИ информации подобного рода — псевдокомпромата.

Марина РАХЛЕЙ.

ОТ РЕДАКЦИИ

Заявление пресс-центра Государственного секретариата Совета безопасности комментировать нет смысла — другим оно быть не может. Остается лишь напомнить одну известную пословицу: дыма без огня не бывает.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Андрэй КЛІМАЎ:

«За мяжой стан майго здароўя толькі пагоршыўся»

15 мая — тры месяцы, як выйшаў на свабоду палітык Андрэй Клімаў. Днямі ён вярнуўся з-за мяжы, дзе праходзіў медыцынскае абследаванне.

Роўна месяц таму, калі Андрэй Клімаў знаходзіўся ў адной з замежных клінік, мы звязаліся з ім па тэлефоне.

"Здароўе дрэннае, — распавёў тады палітык. — Усё аказалася куды горш, чым я чакаў. Турма — не санаторый, але на гэты раз здароўе я падарваў канчаткова. У Беларусь вярнуся, як толькі адчую сябе лепш".

Праўда, на той час Андрэй Клімаў папрасіў не агалошваць інфармацыю аб сваім лячэнні да вяртання ў Мінск. І вось днямі палітык прыехаў дадому.

— Не буду казаць, дзе канкрэтна я знаходзіўся, аднак мне параілі на нейкі час змяніць клімат, — расказвае Андрэй КЛІМАЎ. — Зараз у Мінску працягваю папярэдні курс абследавання. Даюць аб сабе ведаць усе старыя хваробы пасля арышту, зняволення і, суадносна, стрэсу.

— Што кажуць урачы?

— Прапісалі дамашні пасцельны рэжым. Самаадчуванне такое, што пакуль мяне нічога не цікавіць. Нават спіртныя напоі ўрачы катэгарычна забаранілі ўжываць у любых дозах. Дарэчы, як аказалася, змена клімату і знаходжанне за мяжой толькі пагоршылі мой стан здароўя. Таму і вярнуўся ў Мінск.

— Якія бліжэйшыя планы?

— Зараз у рабоце мая новая кніга, і, як толькі паправіцца здароўе, адразу ж арганізую яе прэзентацыю.

Алесь СІВЫ.

ІНФАРМАЦЫЯ ПА СПРАВЕ

Нагадаем, што вядомага палітыка Андрэя Клімава датэрмінова вызвалілі з мазырскай калоніі 15 лютага.

Апазіцыйны лідэр, дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання Андрэй Клімаў быў арыштаваны 3 красавіка 2007 года за апублікаваныя ў інтэрнеце публіцыстычныя артыкулы. Супраць палітыка была ўзбуджана крымінальная справа па артыкуле 361 ч.3 КК РБ "Заклікі да змены канстытуцыйнага строю, якія ажыццяўляліся з дапамогай СМІ".

У ізалятары ў палітыка адбыўся сардэчны прыступ. 1 жніўня на практычна закрытым судзе Клімаў быў асуджаны на 2 гады зняволення ў калоніі строгага рэжыму.

Раней палітык правёў чатыры гады ў турме па абвінавачванні ў эканамічных злачынствах, а таксама быў асуджаны на 15 месяцаў зняволення ("хіміі") за арганізацыю вулічных акцый пратэсту. Праваабарончая арганізацыя Amnesty International прызнала Андрэя Клімава вязнем сумлення.

В Минске открылся супермаркет стоимостью 3,6 миллиона долларов

Группа "Вестер" (Калининград) открыла в Минске супермаркет стоимостью 3,6 миллиона долларов.

Его адрес — угол проспекта Дзержинского и улицы Уманской. Перед магазином — автопарковка на 470 мест.

Площадь супермаркета 4,6 тысячи квадратных метров. В торговом зале — 16 кассовых терминалов.

Сеть "Вестер" создана в 2006 году на базе калининградской группы "Вестер". К концу 2007 года сеть быть представлена в 22 регионах России, а также в Казахстане и в Украине. В 2008 году компания запустит в строй около 30 торговых объектов общей площадью более 150 тысяч квадратных метров.

БОЛЬ

Даже грабитель не ворует у нищего

Как точно в одном из номеров вашей газеты подполковник запаса КГБ В.Костко описал состояние нашего народа: рабские условия трудящихся, то есть взятая откуда-то контрактная система, сразу же с первого дня работы ставящая каждого гражданина в зависимость от нанимателя и мгновенно отнимающая у него право высказывать свое мнение, не говоря уже о какой-то критике, а тем более возражениях.

Мелкий бизнес, то есть предприниматели, поставлены в такие условия, что дело идет к их самоликвидации. Чего стоят одни лишь командные действия многотысячной армии чиновников различных контролирующих ведомств, получающих хорошую зарплату, всеми возможными и невозможными путями выкачивающих из производителей под разными предлогами налоги и подати. При этом, заметим, любые идущие снизу от народа предложения пресекаются сразу же и запрещаются.

Вот в г.Новополоцке 3000 граждан обращаются в местные власти за разрешением провести пикет по отзыву депутата, проголосовавшего за отмену льгот. Итог: депутат остается на своем месте, а активист В.Шевченко оштрафован на 35 базовых величин.

Регулярно слежу за государственной печатью и никак не могут понять, почему же никто ничего не пишет об отнятых льготах инвалидов. Сам решил выразить возмущение через публикацию статьи в одной из газет. Не печатают. Звоню в редакцию. Отвечают: пишем много, но если ваша статья нам подойдет — напечатаем". Так до сего дня не могут разобраться, подойдет или нет. И понятно, что такой материал им не подойдет и никто из государственных СМИ печатать не будет.

Абсолютно все знают, что самые беззащитные и несчастные граждане нашей страны — это инвалиды. Мне в жизни множество раз пришлось видеть их быт, жизнь и повседневную борьбу за выживание. С 1988-го по 1992 год я был первым председателем городского общества инвалидов г.Гродно и поэтому как никто другой знаю трудности и беды этой категории людей.

Но вот 16 декабря 2008 года этих граждан нашей страны, только не пойму за какие грехи, лишают льгот, которыми они пользовались десятилетиями. Чтобы не перечислять весь их перечень, скажу о главных, тех, которые имели судьбоносное значение для людей, обиженных судьбой. Представьте себе: инвалидов с болезнями опорно-двигательного аппарата, безногих, колясочников лишают льгот на автомашину и тех капель бензина (40 литров в месяц), которые приобретались инвалидами по льготной цене. Так как же они будут жить, из каких источников смогут собрать деньги на транспорт, если сегодня машина стоит 8—15 миллионов белорусских рублей, а пенсия инвалидов едва превышает 180.000—200.000 рублей.

Протезы, корсеты, обувь и т.д. ранее были бесплатными, а теперь придется платить. Так не кажется ли вам, господа правители, что вы их попросту бросили? Записавшись на прием к депутату Национального собрания РБ А.Н.Буровой, я задал ей вопрос: голосовала ли она лично за отмену льгот? Ответила, что воздержалась. А когда я спросил, как могло случиться такое, что инвалидов-опорников, безногих, колясочников и т.д. они лишили льгот на автотранспорт, не поверите, сделала такой вид, будто впервые об этом слышит, будто я что-то напутал. А помощник ее даже рассказала, что в декабре 2007 года смотрела какой-то документальный фильм, как "афганцам" вручали автомашины, и мои претензии, кажется, не верны. Мне не оставалось ничего другого, как доложить об этом разговоре председателю областного общества инвалидов, который вместе с директором одного из наших инвалидных предприятий договорился с ней о встрече, во время которой еще раз подтвердилось то, что **депутаты не знают, за что голосуют**.

Удивляет меня и поведение руководителя нашего Республиканского общества инвалидов В.П.Потапенко, который ведет теперь какую-то мышиную возню за круглыми, квадратными или овальными столами с теми чиновниками о том, что колясочники и безногие лишены этих и других льгот. К чему эти разговоры, если любому здравомыслящему человеку понятно: если не вернуть льготы, то те же инвалиды-колясочники потеряют в итоге не только способность к работе, общению, но и вообще интерес к жизни на этой грешной земле. Да и вообще, как можно разговаривать с теми чиновниками, которые лишили своих отцов и матерей 50%-ной льготы на проезд в общественном транспорте. Уверен, что они постараются убедить инвалидов, что в коляске можно не только передвигаться, но и летать.

Даже грабитель не станет грабить нищего, а наши чиновники додумались до того, чтобы у нищих и больных отобрать их торбу.

Г.К.ОКОЛОВ,
житель г.Гродно.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 МАЯ 2008 г.

ДИПКОРПУС

Два языка Любомира Регака

Конечно, Временный Поверенный в делах Словакии в Беларуси Любомир РЕГАК знает языков гораздо больше. Точнее, шесть. И родной, словацкий, в них не входит. Но мы разговаривали только на двух. Любопытная закономерность: аккредитованные в Минске иностранные дипломаты порой употребляют белорусский язык чаще некоторых белорусов.

— Начнем с самого начала.

— Родился я в Чехословакии. Моя родина — маленький город, который считается столицей словацкого пива и называется Топольчаны. Славянское название. Наверное, произошло от "тополей". В окрестностях очень много старинных усадьб. В одной из них находится музей Пушкина, потому что туда на каникулы к сестре ездила Наталья Гончарова с детьми Александра Сергеевича.

— Я в тех краях встал на горные лыжи...

— А я перестал на них кататься после того, как сломал ногу. Моя мама всю жизнь работала в бюро путешествий. Папа преподавал в техникуме. Из пяти детей я — четвертый. У меня три брата и сестра. Семья даже для тех времен не очень типичная. Но есть большой плюс: больше детей — больше общения.

— А как вы попали в дипломаты?

— После школы. У нас двухступенчатая система: восемь классов основной школы, а потом четыре года гимназии. Тогда в последний год можно было пройти обучение в специальной школе, где готовили к учебе за рубежом. На всю Словакию такая школа была одна. Принимали туда только после сдачи экзаменов и ставку делали на углубленное обучение иностранных языков. Тех же, кто оставался в Словакии, автоматически направляли в вузы, которые нас рекомендовали. В моем случае это был юридический. Мне нравились гуманитарные науки, хотел быть юристом. Не получилось. Мне предложили факультет международных отношений в МГИМО. Учеба совпала с замечательными временами. Это была, если так можно сказать, продвинутая перестройка. Открылись архивы, каждую неделю в свет выходило что-то неизвестное. Много новой информации, постоянный обмен мнениями — для меня все это было очень интересно. Гораздо интереснее, нежели я бы учился в тогдашней Чехословакии, где вплоть до революции 1989 года был настоящий застой. В МГИМО я впоследствии защитил кандидатскую диссертацию. Затем начал работать в Министерстве иностранных дел Словакии. Произошло это за несколько месяцев до разделения Чехословакии. Получается, что в нашем МИД я работаю с самого начала. Уже летом 1993-го у меня состоялась первая долгосрочная командировка. Это вновь была Москва, где я пробыл почти пять лет. Оттуда мы были аккредитованы в Беларуси, и я ездил сюда несколько раз в рабочие командировки. В том числе принимал участие в 1995 году во вручении нашим послом Александру Лукашенко верительных грамот. Прекрасно все помню. Было интересно послушать молодого динамичного президента. Потом был центральный аппарат словацкого Министерства иностранных дел. Затем меня на четыре года направили заместителем посла в Португалию. Вернулся опять в МИД, был на посту европейского корреспондента МИД — координатора по вопросам внешней политики Евросоюза как раз во время нашего вступления в ЕС. В 2006 году послали в Минск. Так я впервые стал руководить посольством.

— Какая у вас семья?

— Типично дипломатическая. Жену "нашел" на работе, что бывает очень часто. Зовут ее Дана. Мы вместе работали в посольстве в Москве. В Москве и поженились. Попросили обвенчать нас словака — архиепископа Доминика Грушовского, который работал Апостольским нунцием именно в Беларуси. Он по нашей просьбе специально приехал в Москву. Жена была вынуждена скорректировать свою карьеру и скопировать мой путь. Хотя она сама работает сейчас в словацком МИД. Буквально на днях отметили 10-летие со дня нашей свадьбы. У нас растут две девочки. Имена выбирали старинные и весьма красивые. Одну назвали в честь прабабушки Магдаленой, другую — Альжбетой. Младшая ходит здесь в детский садик, очень счастливый ребенок. Старшая учится в одной столичной русскоязычной гимназии. Но к белорусскому языку тоже имеет отношение. Она занимается в воскресной школе в костеле на Золотой Горке. Он ближе всех находится к нашему дому и больше других ей нравится. Маленький, уютный, похожий на словацкие деревенские костелы. Дочь готовится к первому причастию.

С семьей.

— Чем занимаетесь в свободное время?

— Должен сказать, что его очень мало. У дипломатов нет твердого графика работы. Иногда приходится работать почти целые сутки. Увлекаюсь музыкой, немного играю на пианино. Очень люблю Баха, особенно его органные сочинения и мессы. Люблю поэзию. Всегда изучаю историю той страны, где нахожусь. Это очень помогает в общении. Часто путешествуем.

— Какими вам показались белорусы?

— Наверное, это самый распространенный вопрос. И очень сложный. Здесь я нашел как добрых и приветливых людей, так и прямо им противоположных. Подобное есть в любой стране. Речь идет лишь о соотношении тех и других. Настоящим открытием для меня стало то, что эта земля имеет огромный исторический заряд, а об этом будто специально не говорят. Взгляните на карту Великого княжества Литовского...

— Я заметил, что она висит у вас на стене.

— Белорусам нужно гордиться своей историей. Здесь же все "тутэйшыя". Нельзя ее ограничивать только 1994-м, 1917-м или третьим разделом Речи Посполитой. Когда Словакия обрела государственный суверенитет, нам тоже пришлось многое в своей истории заново осмыслить. Она, как и у вас, очень древняя. Белорусы много чем могут гордиться, но надо уметь трезво и критически глядеть на те эпохи, которые подвергались фальсификациям и мистификации.

— Русский язык вы выучили в Москве?

— Нет, еще в Чехословакии. Учили с пятого класса. Естественно, как и все обязательное, многие его недолюбливали. А мне русский нравился с самого начала.

— А белорусский?

— Адкрыццё. Калі я раней наведваў Беларусь, бачыў, што гэта нешта іншае, але вельмі падобнае на расійскую мову. А тут (унікаючы больш глыбей) убачыў, што гэта зусім не варыяцыя мовы рускай. Для мяне, славака, нелагічна тое, што адбываецца з беларускай мовай у час, калі ўсюды побач мы бачым сапраўдны рэнесанс нацыянальных моў і культур, зварот да сваіх крыніц, прыдушаных былымі імперіямі. Калі б мае продкі ў XIX стагоддзі не адвяавалі славацкую мову, мы бы зараз, можа, размаўлялі па-венгерску альбо па-чэшску. Жаданне людзей размаўляць на той мове, якая выжыла праз стагоддзі, цалкам зразумелая рэч. Тое, што беларуская мова жыве, вельмі цудоўна! Можа, яе цяжка пачуць у Мінску, бо тут жыве шмат людзей з іншых краін былога Савецкага Саюза. Але ў правінцыі і сярод інтэлектуалаў на ёй у рэальным жыцці насуперак насільнай асіміляцыі размаўляе даволі шмат людзей, што вельмі прыемна. Гэта сапраўды вялікая і прыгожая мова. Яна, кажучы па-славацку, любазвучная. І больш бліжэй да нашай, чым расійская. Дарэчы, я пераклаў на славацкую мову некалькі вершаў Ніла Гілевіча. Дапамог Васілю Сёмухе перакласці на беларускую мову вершы вядомага славацкага паэта Павала Орсага-Гвездаслава, якія ўпершыню гучалі сёлета ў сакавіку падчас першай агульнабеларускай дыктоўкі, у якой я з вялікім задавальненнем прыняў удзел.

Александр ТОМКОВИЧ.

Любомир Регак с дозиметром в чернобыльской зоне.

ДОБРАЯ НАВІНА

Рэкорд па двайнятах і трайнятах

Абсалютны рэкорд нараджэння двайнятаў, трайнятаў і квартэта немаўлят усталяваны ў Беларусі.

У 2007 году з'явілася на свет 965 двайнятаў, 20 трайнятаў і 1 чацвярнятаў (Мінск). Гэта абсалютны рэкорд за апошнія два дзесяцігоддзі.

Першы беларускі феномен нараджэння чацвярні быў у 2004 годзе — "квартэт" хлопчыкаў папоўніў сям'ю мінчукоў.

Павелічэнне колькасці шматплодных родаў у Беларусі абумоўлена як генетычнымі фактарамі, так і ўжываннем новых сучасных метадаў, у прыватнасці, экстракарпаральнага апладнення (ЭКА) — колькасць "дзяцей з прабіркі" з года ў год узрастае.

У 2007 годдзе ў Беларусі ўпершыню за апошнія 15 гадоў колькасць нованароджаных перавысіла 100-тысячную мяжу.

ЧУЛІ?

У Беларускай аўтакефальнай царквы новы епіскап

У Кафедральным саборы св.Кірылы Тураўскага ў Брукліне (Нью-Йорк) быў хіратанізаваны ў епіскапскую годнасць архімандрыт Святаслаў (Вячаслаў Логін).

Абрад хіратоніі быў выканаы архіепіскапам Уманскім і Дэтройцкім Аляксандрам, епіскапам Барыспальскім Пасіем ды епіскапам Х'юстанскім і Тэхаскім Макарыюсам пры ўдзеле вялікай колькасці святароў і вернікаў з Нью-Йорка, Нью-Джэрсі і Канады.

З-за «чалавечага фактару»

"Чалавечы фактар" стаў прычынай пераносу даты правядзення першага з'езда рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь". Ён мусіў адбыцца 17 мая, але збярэцца толькі ў канцы мая — пачатку чэрвеня.

Паводле слоў намесніка старшыні аб'яднання Аляксандра Шацько, Мінская гарадская арганізацыя не паспела правесці канферэнцыю па вылучэнні дэлегатаў на з'езд. І гэта дзіўна, бо ні для каго не сакрэт, што мерапрыемствы "Белай Русі" праводзяцца з дапамогай дзяржавы.

Нагадаем, аб'яднанне было ўтворана ў лістападзе 2007 года. Яго ўзначаліў міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. Прадстаўнікі "Белай Русі" не выключаюць, што з часам яна можа пераўтварыцца ў палітычную партыю. Праўладную, зразумела.

СІТУАЦЫЯ

КДБ дбае пра беларускіх студэнтаў

Па заканчэнні майскіх святаў студэнт першага курса Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта Алег Грубіч ехаў з Мінска на месца вучобы ў Вільнюс, але пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы высветлілася, што ён уключаны ў спісы невыязных. Па вяртанні ў Мінск да хлопца сталі праяўляць узмоцненую цікавасць супрацоўнікі КДБ.

Калі як мінімум чатыры дзяржаўных службоўцы марнуюць паўдня на тое, каб запалохаць маладога чалавека 22 гадоў, складваецца ўстойлівае адчуванне кафкіанскага абсурду.

Пасля таго, як у Алега ў цягніку Смаленск—Вільня памежнікі адабралі пашпарт і паставілі па-над штампам аб перасячэнні мяжы адзнаку "анулявана", ён паспрабаваў атрымаць тлумачэнні ў РУУС па месцы жыхарства. Там нічога не ведалі і перанакіравалі маладога чалавека ў АГІМ, супрацоўнікі якога даволі хутка выдалі даведку, што ў праславуты спіс ён патрапіў па лініі ваенкамата. У ваенкамаце Першамайскага раёна адна з супрацоўніц, паглядзеўшы матэрыялы асабістай справы, сказала, што яшчэ ў 2006 годзе супраць Алега была ўзбуджана крымінальная справа па факце ўхілення ад ваеннай службы. Справа ў тым, што раней Алег быў студэнтам Акадэміі мастацтваў, але пасля падзей сакавіка 2006 года быў адлічаны нібы за "акадэмічную непаспяховасць". Пасля гэтага ён вучыўся ў Польшчы, а ўлетку мінулага года паступіў у ЕГУ. Варта адзначыць, што ў Літве Алег стаў на вайсковы ўлік у Кансуляце Рэспублікі Беларусь.

Аднак у ваенкамаце высветлілася некалькі цікавых падрабязнасцяў: улік у Кансуляце па цяперашнім заканадаўстве ўжо не мае значэння, а адлічаныя з вышэйшых навучальных устаноў за акадэмічную непаспяховасць студэнты не могуць атрымаць адтэрміноўку, нават калі зноў вучацца на дзённым аддзяленні. Пасля абвяшчэння ўсіх гэтых правіл супрацоўніца ваенкамата тым не менш запэўніла, што адправіць паведамленне на выключэнне Алега са спісу невыязных. Акрамя таго, маладому чалавеку была ўручана позва з'явіцца на медыцынскі агляд 16 чэрвеня. Напрыканцы гутаркі гэтая ж супрацоўніца прамым тэкстам заявіла, што Алегам цікавяцца ў КДБ, і сказала прыйсці на наступны дзень, каб забраць даведку аб выключэнні са спісу.

Раніцай наступнага дня Алегу патэлефанавалі з КДБ і папрасілі прыйсці ў ваенкамат крыху раней. Ад гэтай "прывабнай" прапановы ён адмовіўся і прыйшоў у прызначаны час. На ганку ваенкамата Алега чакалі чатыры чалавекі: учарашняя супрацоўніца, хтосьці з ваенкаматнага кіраўніцтва і двое ў цывільным. Супрацоўніца сказала, што "прыйдзецца пагутарыць самі ведаеце з кім". Аднак спачатку маладога чалавека выклікаў да сябе начальнік, які распавёў, што з "органамі трэба сябраваць". Затым прапаноўваў паказаць, дзе знаходзіцца медкамісія, аднак пасля адмовы Алега ісці куды б ні было, паклікаў двух прадстаўнікоў камітэта Дзяржбяспекі ў свой кабінет. Апошнія прадставіліся як супрацоўнікі Першамайскага аддзела КДБя. Ніякіх пасведчанняў, якія пацвярджаюць іх паўнамоцтвы, гэтыя людзі не прад'явілі.

Адначасова з гэтым супрацоўніца ваенкамата аддала знаёмай Алега, якая чакала ў калідоры, даведку аб выключэнні хлопца са спісу невыязных. Дадзенае паведамленне ўяўляе сабой паперку, на якой няма нават пячаткі. Ад гутаркі з супрацоўнікамі КДБ і Алег, і яго знаёмая адмовіліся. Пры гэтым людзі ў цывільным настойвалі на сваім праве "гутарыць для атрымання інфармацыі" з "любым чалавекам, у любым месцы", прапаноўваючы "праехаць з імі ў аддзяленне для выпісу афіцыйнай позвы", а пасля адмовы паабяцалі, што афіцыйную позву прынясуць "па месцы жыхарства на працягу паўгадзіны".

"10 мая я накіраваўся ў Аддзел па грамадзянстве і міграцыі па месцы жыхарства, каб даведацца, ці выключылі мяне са спісу невыязных, — распавёў "Народнай волі" Алег Грубіч. — Усё застаецца ў падвешаным стане. Ніякай афіцыйнай паперы мне не далі, проста на словах сказалі, што я застаюся невыязным. У выпадку, калі я не атрымаю дазволу на свабоднае перамяшчэнне, то буду вымушаны звярнуцца ў суд".

Хлопец лічыць, што насамрэч ваенкамат выкарыстоўваюць у якасці прыкрыцця: "За гэтыя дні ў галаве я перавярнуў безліч варыянтаў. Пачынаючы ад сітуацыі са Змітром Жалезнічэнкам, якому не далі аднавіцца ў ВНУ і адправілі ў войска, да таго, што мяне могуць абвінаваціць ва ўдзеле ў незарэгістраванай арганізацыі. Кадэбэшнікі, з якімі я размаўляў у ваенкамаце, менавіта на гэта і ціснулі. Іх цікавіла мая культурніцкая дзейнасць — ад правядзення ў Вільні агульнанацыянальнай дыктоўкі да арганізацыі культурніцкіх канферэнцый. Толькі пры чым тут незарэгістраваныя арганізацыі, я зразумець не магу".

Стася СЛУЦКАЯ.

ДАРЭЧЫ

У Насты Палажанка МУС папрасіла прабачэння

Намесніца старшыні незарэгістраванага "Маладога фронту" Наста Палажанка атрымала адказ з Міністэрства ўнутраных спраў на зварот з патрабаваннем растлумачыць, чаму дзяўчына ўнесена ў "спіс невыязных".

Нагадаем, уначы 4 красавіка Насту высадзілі з цягніка, што накіроўваўся ў Варшаву, на падставе таго, што на непаўнагадовую маладафронтаўку быццам бы заведзена другая крымінальная справа, якая ўжо знаходзіцца на разглядзе ў пракурора. З гэтай нагоды дзяўчына нібыта і была занесена ў "спіс невыязных", і ёй было забаронена пакідаць межы Беларусі.

На наступны дзень Наста напісала заяву з просьбай патлумачыць, што гэта за справа, хто і калі яе завёў і чаму яна наогул ні пра якую справу супраць сябе не ведае.

"Звесткі аб узбуджэнні крымінальных спраў у 2008 годзе ў адзіным дзяржаўным банку даных аб правапарушэннях адсутнічаюць, — гаворыцца ў адказе МУС. — Вашы пашпартныя даныя выключаны з ведамаснага банка даных МУС аб грамадзянах РБ, права якіх на выезд за мяжу часова абмежавана, таму што яны былі памылкова змешчаны ў банк у сувязі са збоем у працы праграмна-апаратнага комплексу. МУС Беларусі прыносіць Вам свае прабачэнні".

Трэба адзначыць, што адказ Міністэрства ўнутраных спраў напісаны па-беларуску.

"Безумоўна, гэты крок добра спланаваны, — каментуе адказ з МУС Наста Палажанка. — У гэты дзень у Варшаве я павінна была мець шэраг важных сустрэч, звязаных з дзейнасцю "Маладога фронту", якія, пэўна, не былі выгадныя ўладам, таму смешна нават меркаваць пра нейкі тэхнічны збой. Я параюся з юрыстамі і, магчыма, буду падаваць у суд на МУС з патрабаваннем маральнай кампенсацыі: нельга спакойна прымаць тое, што ў дзве гадзіны ночы мяне, непаўнагадовую дзяўчыну, незаконна здымаюць з цягніка і вымушаюць адну правесці ноч на вакзале ў чужым горадзе. Тым больш нельга быць упэўненай, што ў наступны раз у "праграмна-апаратным комплексе" нечакана не здарыцца збой і мяне зноўку не павярнуць на мяжы".

РЭГІЁН

На Гродзеншчыне падаражэла мабільная сувязь

Паводле рашэння Гродзенскага абласнога савета дэпутатаў, у рэгіёне павысіўся падатак на паслугі мабільнай сувязі. Цяпер жыхары вобласці замест пяціпрацэнтнага падатку будуць плаціць дзяржаве дзесяціпрацэнтны.

Непапулярнае рашэнне дэпутаты абгрунтавалі тым, што падатак на паслугі мабільнай сувязі ў Гродзенскай вобласці быў самы нізкі па краіне.

Як сцвярджаюць супрацоўнікі аператараў мабільнай сувязі, яны дазналіся аб павышэнні падатку толькі пасля таго, як заўважылі, што абанентам павялічыўся кошт званкоў, а людзі пачалі звяртацца за тлумачэннямі.

Тым часам гродзенскія дэпутаты павысілі падаткі не толькі на паслугі мабільнай сувязі. Адпаведным рашэннем павышаны памер падаткаў за паркоўку транспартных сродкаў у спецыяльных месцах, рамонт і тэхнічнае абслугоўванне аўтамабіляў для фізічных асоб. У гэты спіс трапілі і грамадзяне, якія валодаюць сабакамі ці выкарыстоўваюць іх у прадпрымальніцкай дзейнасці.

ПАДЛІЧЫЛІ

Хто ў нас «стотысячнікі»?

У 14 гарадах Беларусі колькасць насельніцтва перасягае 100 тысяч чалавек, паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу.

Лідэрам з'яўляецца, вядома, сталіца. У Мінску на 1 студзеня гэтага года налічвалася 1 млн 814,8 тыс. жыхароў. На другім месцы — Гомель (484,5 тыс.), на трэцім — Магілёў (370,6 тыс.). Далей ідуць іншыя абласныя цэнтры: Віцебск (346,2 тыс.), Гродна (325,8 тыс.) і Брэст (314,8 тыс.).

У Бабруйску на 1 студзеня гэтага года пражывалі 218,4 тыс. чалавек, у Баранавічах — 168,3 тыс., у Барысаве — 149,8 тыс., у Пінску — 130,4 тыс., у Оршы — 122,6 тыс., у Мазыры — 111,9 тыс., у Салігорску — 101,1 тыс., у Наваполацку — 100,6 тыс. чалавек.

Крыху "не дацягнулі" да 100-тысячнікаў гарады Маладзечна і Ліда (на 1 студзеня налічвалася адпаведна 98,4 тыс. і 95,7 тыс. жыхароў).

На сустрэчы з пісьменнікамі!

На сядзібе Таварыства беларускай мовы (Мінск, вул.Румянцава, 13) працягваюцца сустрэчы з пісьменнікамі. У гэтым месяцы можна будзе паслухаць **Антаніну Хатэнка** з гутаркай пра міфалагічныя матывы ў літаратуры XX стагоддзя (15 мая). Бацькам і дзецям, якія пойдуць у першы клас, цікава будзе сустрэцца з аўтарам "Буквара" **Анатолем Клышкам** (22 мая). А 27-га **Уладзімір Арлоў** прэзентуе сваю аўдыёкнігу "Адкуль наш род".

Пачатак імпрэз у 18.30. Уваход вольны.

Ірына МАРАЧКІНА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 МАЯ 2008 г.

Уцёкі ў нікуды

Ліст былога палітвязня Аляксея Шыдлоўскага, які папрасіў палітычнага прытулку ў Чэхіі і атрымаў адмову

Падзеі апошніх пяці месяцаў кардынальна змянілі прыярытэты ў маім жыцці. За гэты час, які падаецца мне не месяцамі, а доўгімі гадамі, я паспеў даведацца пра асабістасці людскога характару больш, чым у турме, чым у падполлі, чым за ўсё папярэдняе існаванне.

Ніколі раней не думаў пра тое, як атрымліваюць палітычны прытулак уцекачы з Беларусі. Амаль не дапускаў, што на такі ўчынак магу пайсці сам. Але калі напрыканцы мінулага года лёс паставіў гэтае пытанне, рашэнне было на карысць ад'езду. Ці слушна я зрабіў, не вырашыў для сябе дагэтуль.

Падобная сітуацыя можа здарыцца з кожным. І гэтыя радкі пішуцца, каб іншыя не рабілі тых памылак, што нарабіў я.

...Каму хочацца яшчэ раз трапіць за краты.

Памылка першая

5 снежня мінулага года ў пераходзе метро "Пушкінская", у крамцы з кніжкамі і дыскамі, я паспрачаўся з прадаўцом. Мне не спадабалася, што паліцу з дыскамі закрывае партрэт Лукашэнкі, які замінае аглядаць тавар. Мае заўвагі былі ўспрынятыя ў штыхі, на што, верагодна, паўплывалі значкі ў мяне на заплечніку. Мне давялося партрэт проста прыбраць, каб не замінаў. Гэты мой учынак, верагодна, чакаўся, таму што праз секунду мяне ўзялі за грудкі работнік крамы і нейкі хлопец у цывільным і пачалі, падлупцоўваючы, выкідаць за дзверы.

За апошні год у мяне здарылася столькі непрыемных сустрэч з падобнымі асобамі, частка з якіх аказвалася супрацоўнікамі "службаў", што нервы мае не стрывалі. Я чалавек не слабы і тых абодвух з лёгкасцю адкінуў прэч ад сябе і паспрабаваў сысці. Але са спіны падбег яшчэ нехта, мяне стукнулі бутэлькай па галаве ды пачалі збіваць. Усё, на што мяне хапіла, гэта некалькі разоў добра пацэліць камусьці ў адказ, перш як страціць прытомнасць.

Ачуняўшы, зразумеў, што знаходжуся ў пастарунку. Міліцыянты з цікавасцю глядзелі на мой скрываўлены твар ды рассечаную галаву. Пацікавіліся, ці трэба мне "хуткая". Я сказаў, што абыдуся. Маіх спарынг-партнёраў ніхто затрымліваць і не збіраўся. Нехта адразу паехаў дадому з места здарэння, нехта пайшоў да доктара ўзяць даведку пра сінякі. Мяне распыталі пра інцыдэнт і, перапісаўшы пашпартныя звесткі, прапанавалі таксама ісці дадому. Было і пытанне, ці не жадаю я напісаць заяву з просьбай узбудзіць крымінальную справу на маіх апанентаў. Мяркуючы, што ўсё ўжо і так вырашылася, я адказаў адмоўна.

Як пасля патлумачыла адвакатка, гэта звычайны фатальны крок. У беларускай юрыспрудэнцыі заўсёды вінаваты той, хто заяву не напісаў альбо напісаў другім. Што праўда, іншы бок таксама не думаў рабіць нічога падобнага, пакуль праз суткі мае пашпартныя звесткі не дайшлі "да верху" і да "пацярпелых" не прыехалі патрэбныя людзі з тлумачэннямі, што заяву напісаць варта, проста каб не было праблем.

Праз тры дні, адлежваючыся на канапе ды ходзячы на працэдуры да лекара, які зафіксаваў у мяне страсенне мазгоў, рассечаную галаву ды яшчэ шмат дробных пашкоджанняў, я атрымаў нечаканую прапанову сустрэцца ад чалавека, якога амаль не ведаў...

За 2007 год я тройчы адбываў адміністрацыйныя арышты паводле звычайнага для актывістаў апазіцыі абвінавачвання ў "бруднай лаянцы". Арыштаў магло быць як мінімум пяць, калі б не добрыя знаёмыя. Калі да іх даходзіла інфармацыя пра адлоў апазіцыянераў і я быў у гэтым спісе, мяне папярэджвалі. Толькі дзякуючы гэтаму я трапіў на "Еўрапейскі марш" і некаторыя іншыя мерапрыемствы. Даводзілася па тыдні і болей адседжвацца ў ціхім месцы, не выходзячы на вуліцу, але лепш там, чым на Акрэсціна.

Я сустрэўся з гэтым знаёмцам. Ён паведаміў мне, што супраць мяне неўзабаве ўзбудзяць крымінальную справу паводле арт.339.3 "Злоснае хуліганства з нанясеннем цялесных пашкоджанняў" і я буду арыштаваны...

Ад'езд у нікуды

На роздум было менш за двое сутак: субота і нядзеля. Я вырашыў паехаць у крыху знаёмы мне Кіеў і перачакаць там. Тут варта сказаць асаблівы дзякуй супрацоўнікам "Хартыі'97", якія мне дапамаглі фінансава. Без гэтай дапамогі я цяпер дакладна не пісаў бы гэтых радкоў, таму што сродкаў на ад'езд на той час у мяне проста не было.

Выдатна разумеючы, што на ўкраінска-беларускай мяжы могуць затрымаць, квіток узяў да Масквы. Цягнік адпраўляўся а трэцяй ночы. Цяжка перадаць, з якім болем, тугой і слязьмі прайшло развітанне з жонкай, роднай хатай. Пасля, ужо ў цягніку, балюча было назіраць, як я ўсё далей ад'язджаю ад роднага месца і накіроўваюся ў невядомасць.

Масква ўразіла колькасцю міліцыянтаў, якія чатыры разы за чатыры гадзіны праверылі ў мяне дакументы, і азербайджанцаў з малдаванамі, акрамя якіх у вакзальных зонах, здаецца, больш ніхто і не працаваў. Узяў квіток да Кіева на кішынёўскі цягнік і накіраваўся ва Украіну.

Кіеў. Два месяцы чакання

Знаёмых у Кіеве я не меў, але меў надзею, што ўдасца зняць кватэру. Выявілася, што жытло ў Кіеве зняць можна толькі праз агенцтва. І каштуюць аднапакаёўкі 500—800 долараў у месяц. Першую ноч правёў на вакзале. З рассечанаю галавою спаць на пластыкавым крэсле зусім нязручна. Зранку праз Мінск пачаў шукаць знаёмых у Кіеве, у якіх можна было б перакантавацца.

Па абедзе ўдалося. Стас Карашчанка, разам з якім мы не адзін раён у свой час заляпілі стыкерамі, жыве ў Кіеве з дзяўчынай у яе кватэры ды працуе на будоўлі. У іх я правёў некалькі дзён, пакуль канчаткова не зразумеў, што таннай кватэры не знайсці, і не знізіў сваіх патрабаванняў, арандаваўшы пакой за 250 долараў у трохпакаёўцы, у якой жылі яшчэ чатыры чалавекі.

Паспрабаваў пайсці да Стаса на будоўлю, дзе ён атрымоўваў 400 долараў за месяц, але хутка зразумеў, што, не акрыяўшы, не пацягну. Адлупцавалі мяне добра.

У Мінску тым часам следчы яшчэ не перавёў мяне з падазронага ў абвінавачаныя, таму дробная надзея, што ўсё абыдзецца, заставалася. Вывучаючы Кіеў ды чакаючы звестак з Радзімы, я сустрэў Каляды, затым Новы год. Пасля прыйшла вестка пра тое, што я цяпер у вышуку ў Беларусі і пагражае мне ад трох да дзесяці гадоў.

Кіеўскія праваабаронцы паведамілі, што атрымаць прытулак тут для беларуса амаль немагчыма, і я вырашыў скіравацца на Захад. Тым больш, жывучы ў Кіеве не ў якасці турыста, а паўнавартаснага жыхара, заўважыў, што ўзровень жыцця тут не дацягвае да мінскага, не кажучы ўжо пра рэгіёны. Мне ж, улічваючы нелегальны статус, не было на што разлічваць.

Мы з жонкаю вырашылі абраць для далейшага пражывання Чэхію. Прычын было некалькі, але асноўнай сталі цэны на жытло. Прадаўшы мінскую аднапакаёўку, можна было б набыць, прыкладам, у паўночнай Чэхіі тры трохпакаёўкі ў невялікіх гарадах каля нямецкай мяжы.

Вырашылі, што спачатку ў Еўрапейскі Саюз палячу я адзін, а Марына далучыцца, калі я атрымаю статус уцекача.

Праблема ўзялася, адкуль не чакаў. Шчыра спадзеючыся на дапамогу беларускай апазіцыйнай эліты ў атрыманні чэшскай візы, я атрымаў поўны аблом. Выявілася, што пасля таго, як ты з'ехаў з краіны, на ўсе твае мінулыя справы забываюцца і нікога ты ўжо не цікавіш. Калі б жа я застаўся і сеў за краты, сітуацыя, безумоўна, была б зусім іншая, і стаўленне да мяне таксама. Абсалютна не распрацаваны механізм дапамогі людзям, вымушаным з'ехаць з краіны.

Зімовымі вечарамі я бадзяўся па малазнаёмым горадзе, не знаходзячы сабе месца. Усе думкі былі звязаныя з роднай краінай. Доўгі час адарваны ад яе, я зразумеў, што няма лепей за Беларусь, нягледзячы на ўсё, што там робіцца, і што эміграцыя — гэта вельмі цяжка. Не лягчэй, чым турма.

Мне пашэнціла сустрэць у Кіеве групку беларусаў, якія тут працуюць і дзеля гэтага кожныя тры месяцы фармальна перасякаюць мяжу. Беларусам ва Украіне можна знаходзіцца 90 дзён, пасля чаго трэба хоць бы на гадзіну пакінуць краіну. Яны, а таксама былы дэпутат Уладзімір Кудзінаў, з якім мы разам "тапталі зону" ў канцы 90-х, моцна мне дапамаглі. Хто фінансава, а хто яшчэ нейкім чынам ці парадай.

Да Кудзінава ў Севастопаль я заехаў пагасцяваць, зрабіўшы яшчэ адну стрэлачку на мапе Еўропы, якую пачаў крэсліць маршрутамі свайго перасоўвання ад дня ад'езду з Мінска. Візу вырашылі спрабаваць дастаць разам. Давялося зрабіць некалькі ліпавых дакументаў пра тое, што я працую ў Кіеве па запрашэнні ўкраінскага боку і маё знаходжанне тут цалкам легальнае. Праз турфірму, якая за тое, што я беларус, таксама ўзяла хабар, я набыў тур выходнага дня ў Прагу. І 3 лютага а 6-й раніцы вылецеў з аэрапорта Барыспаль. Хто ж ведаў, што ў гэты самы аэрапорт я вярнуся праз 45 дзён...

Прага. Два дні ў свабоднай Еўропе

Ляцеў я ў Чэхію з валізай, рэштай грошай ды спісам кантактных даных беларусаў, што атрымалі там прытулак. І яны не падвялі. Сяргей Скаруліс, брат (цяпер ужо нябожчык) якога, Арсень, бараніў мяне як адвакат, калі я ішоў па першай крыміналцы ў 97-м, сустрэў мяне. Тутэйшыя беларусы запэўнілі, што ўжо праз месяц-другі будзем разам піць чэшскае піва, бо ў чалавека з такой біяграфіяй, як у мяне, праблем з атрыманнем статусу не будзе. Раніцай 5 лютага я сеў на аўтобус да Астравы ды накіраваўся ў прыёмны цэнтр для ўцекачоў "Вышні льготы" прасіць азылю...

Людзі на азылі

На КПП азылянскага лагера майму прыходу ніхто не здзівіўся. Выявілася, што прыязджаюць сюды кожны дзень па некалькі чалавек розных нацыянальнасцяў. У кожнага свае прычыны для такога кроку, але рэальна палітычных прычын амаль ні ў кога там няма.

На ўваходзе вы праходзіце ўсе фармальнасці: фота фаспрофіль, адбіткі пальцаў, вас абшукваюць і забіраюць усе прадметы, якія могуць нашкодзіць здароўю. А таксама сродкі сувязі, у тым ліку мабільнік. Калі яго ў мяне апісалі, я зразумеў, што згубіў магчымасць уплываць на сітуацыю, і засталося толькі чакаць, калі мяне выпусцяць з лагера.

А знаходзяцца ў ім людзі ад месяца да чатырох у залежнасці ад таго, ці была ў цябе чэшская віза ды наогул пашпарт. Тых, хто дакументаў не меў, адразу папярэджваюць, што сядзець яны тут будуць па максімуме, 120 дзён. У вашых інтарэсах заключыць дамову з чэшскім адвакатам і скантактавацца з праваабаронцамі да таго, як трапіце ў лагер. Пасля зрабіць гэта ніхто не дазволіць. А без юрыста вы не будзеце мець уяўлення, што з вашай справай дзеецца цяпер...

Пры першым азнаямленні з лагерам я здзіўлена ўбачыў, што ён не розніцца ні вонкава, ні ўмовамі ад калоніі ўзмоцненага рэжыму ў Мінску на вуліцы Кальварыйскай. Той жа плот з калючым дротам, паліцыя з сабакамі на ахове, такія ж баракі і двух'ярусныя жалезныя нары. Па "азылі", што праўда, можна больш вольна рухацца, але ж ён спрэс абсталяваны сістэмай відэанагляду, і кожны крок ваш бачны. На тэрыторыі лагера маецца некалькі мужчынскіх баракаў і адзін сямейна-жаночы. Таксама ў змяшанай зоне ёсць бібліятэка з невялікай колькасцю кніг на розных мовах, сталоўка, пляцоўкі для валейбола і настольнага тэніса. Пагадзінны рэжым у лагеры адсутнічае, таму спаць можна і днём, а ў тэніс гуляць хоць уначы. Але тры праверкі на дзень, сумешчаныя з прыёмам ежы, не даюць расслабіцца. Ранішнія "шмоны" з раскіданнем рэчаў ды пераварочваннем пасцелі таксама нагадваюць, што ты не ў лагеры для адпачынку.

У першыя суткі мяне змясцілі ў карантын, дзе я чакаў размеркавання ў пакой-камеру паводле нацыянальнай прыкметы. Са мной у карантыне быў высокі албанец. Паразмаўляць з ім не выпала. Ён не валодаў англійскай, а я — нямецкай. Яшчэ ў карантыне афіцэр паліцыі ў справах мігрантаў і перакладчык зладзілі сумоўе пра прычыны, якія мяне вымусілі з'ехаць з Беларусі. Тая чэшка абсалютна не валодала сітуацыяй у Беларусі. Ёй нічога не сказалі прозвішчы ні Казуліна, ні Мілінкевіча, ні назвы партый і грамадскіх рухаў. Затое яна выдатна ведала, што "ў вас прэзідэнт пайшоў на перамовы з апазіцыяй, і ўсё не так ужо і дрэнна". Здзівіла яе тое, што я ведаў беларускую мову, якой перакладчыца Ірына не разумела абсалютна. Са слоў афіцэркі, у яе было меркаванне, што ў Беларусі ўсе гавораць па-расійску і лічаць сябе расійцамі.

6 лютага мне выдалі асабісты нумар, які загадалі заўсёды насіць з сабою. Пасля доўгіх роздумаў мяне пасялілі разам з украінцамі, бо, "нягледзячы на тое, што я беларус, прыляцеў жа я з Кіева".

Калі б я меў грошай больш, як дзвесце долараў у эквіваленце, то вымушаны быў бы плаціць за пражыванне ў лагеры са сваёй кішэні каля 150 долараў за месяц. З меншай сумы вылічваць яны не маюць права.

Харчаванне ў лагеры тры разы на дзень: не сказаць каб смачнае, але замала для здаровага чалавека. За месяц азылянты скідалі па 5—10 кг, калі не мелі магчымасці харчавацца дадаткова з міні-крамы на тэрыторыі лагера. Харчаванне ў сталоўцы на аснове чэшскай кухні. Не ўсім яна даспадобы. І калі наш братславянін еў збольшага тое, што давалі, моўчкі, дык прадстаўнікі Азіі ды Афрыкі амаль усё дэманстратыўна выкідалі. Харчаваліся яны ў асноўным чыпсамі ды колай з крамы, яшчэ азіяты круглыя суткі смажылі селядзец з капустай.

Беларусаў там няшмат, як і расійцаў. Беласкурыя там у асноўным гастарбайтэры з Украіны, Албаніі, Сербіі, Македоніі і Турэччыны.

Нашых было разам са мной восем чалавек. Адзін сапраўды палітычны уцякач — Алесь Зінькевіч, сябар Партыі БНФ з Полацка. Астатнія — маладыя хлопцы, якія яшчэ на пачатку стагоддзя прыехалі сюды нелегальна, у пошуках лепшай долі. Давялося доўга ім распавядаць пра беларускую рэчаіснасць, бо самі яны не ведалі нічога.

Прыкладна палова насельнікаў лагера — дробныя, але вельмі шумныя в'етнамцы, якія ўвесь час ходзяць табарамі па дзесяць-пятнаццаць чалавек ды не даюць адзін аднаго ў крыўду. Наяўнасць такой колькасці нацыянальнасцяў дае ўрадлівую глебу для канфліктаў. Там, дзе беларус з украінцам паразумеліся б, турак з нігерыйцам абавязкова дадуць пару разоў адзін аднаму ў пысу. Болей не паспявалі, бо прыбягалі паліцэйскія і забіралі вінаватых ва ўнутраны пастарунак. Там ім выпісваўся штраф 60—120 долараў.

Ёсць у лагеры і свой карцэр. Такія меры вымушалі многіх стрымлівацца тады, калі ўжо, здавалася, іншага выйсця няма. Прыкладам, пры праглядзе футбольнага матчу цёмнаскуры хлопец мог проста падысці ды пераключыць на MTV і пасля гэтага з выклікам зірнуць на ўсіх прысутных. Калі ў кагось не хапала волі ўзяць яго за шчэлепы ды трохі патрэсці, MTV ішло і надалей. Мовы ва ўсіх розныя, таму вербальна паразумецца магчымасці не было.

Асноўная маса азылянтаў — нелегалы, якія прыехалі ў ЕС працаваць, але былі адлоўленыя паліцыяй па міграцыі, і ім нічога не заставалася, як прасіць прытулак, каб застацца ў Чэхіі. Прычыны прыдумвалі абсурдныя, кшталту "я дома пазычыў грошай, а вярнуць няма чым". Тыя ж, хто казаў пра палітычныя матывы, звычайна не арыентаваліся ў сітуацыі ў сваёй краіне, і іх хутка выводзілі на чыстую ваду.

Так ішоў дзень за днём. Людзей выклікалі на размовы, пасля давалі адмовы ў статусе, яны пісалі апеляцыю ў суд, тады іх пераводзілі ў лагер вольнага тыпу да рашэння, якое магло быць вынесенае толькі праз год. Увесь гэты час гастарбайтэры зацята працуюць на будоўлях, а калі прыходзіць паўторная адмова, зноў ідуць здавацца на азыль, прыдумляючы іншую прычыну.

Мяне ж ніхто і нікуды не выклікаў. Пазней патрапіў набыць тэлефонную картку ды з аўтамата, што на тэрыторыі лагера, раз-пораз званіў у Мінск, даючы аб сабе знаць. Толькі аўтамат праслухоўваўся, і кожны раз, калі я спрабаваў распавесці пра ўмовы ўтрымання ў лагеры, сувязь раз'ядноўвалася.

Нарэшце, на чацвёрты тыдзень, калі з лагера ўжо адпусцілі людзей, якія заехалі туды да мяне і пасля мяне, я пачаў разумець, што нешта не так. Высветліў, што чалавек, які працуе ў адной з праваабаронных арганізацый Чэхіі і якога я прасіў паведаміць тым самым праваабаронцам пра мой прыезд, не зрабіў гэтага. Наўмысна ці па дурасці, я не ведаю. Калі жонка здолела сама знайсці іх кантакты ды паведаміць пра мяне, яны былі шакіраваныя і паспрабавалі нечым дапамагчы, але было ўжо позна.

Некалькі разоў на тыдзень, па начах, калі ўсе спалі ў сваіх пакоях, з лагера знікалі людзі. "Сукамернікі" распавядалі, што за імі прыходзіў нарад паліцыі, надзяваў на рукі кайданкі ды кудысьці вывозіў. Аднойчы так знік албанец, з якім я разам трапіў у лагер...

Ізноў кайданкі

18 сакавіка а трэцяй ночы ў пакой увайшлі прадстаўнікі паліцыі ў справах мігрантаў ды паліцыі звычайнай. Мне загадалі сабраць рэчы і надзелі кайданкі. Думаў, што мяне, напэўна, высылаюць у Беларусь, дзе чакаюць доўгія гады ўдумлівага таптання зоны строгага рэжыму. Ужо паза лагерам мне патлумачылі тое, пра што мяне не папярэджваў ніводзін праваабаронца. Згодна з Дублінскім пагадненнем, у Еўрапейскім Саюзе пры наяўнасці некалькіх дзейсных віз адказнасць за палітуцекача можа несці тая краіна, якая выдала больш доўгатэрміновую візу. Такая на момант прылёту ў Чэхію ў мяне была — літоўская. Праўда, не шэнгенская, а нацыянальная, але гэта не мела значэння.

Чэхі не абавязаны былі мяне высылаць, і калі б мясцовыя палітыкі, якія сябруюць з беларускай апазіцыяй, даведаліся пра мяне раней, ніхто б мяне нікуды не выслаў, і цяпер я знаходзіўся б у Празе ўжо, хутчэй за ўсё са статусам палітуцекача. Але гэтага не адбылося і, прасядзеўшы дзевяць гадзін у кайданках, я на паліцэйскім аўто быў дастаўлены ў аэрапорт. Людзі навокал азіраліся на мяне, як на сапраўднага злачынцу, ускудлачаны (узялі з ложка), у кайданках, з трыма паліцэйскімі, я выглядаў, як злодзей з галівудскіх фільмаў. У аэрапорце мне яшчэ раз паведамілі, што я дэпартуюся ў Літву, дзе пра мяне ведаюць і маю справу будуць разглядаць там. Са мною паляцелі двое чэшскіх "рэмба" ў цывільным, якія не давалі зрабіць кроку ўбок. І, нягледзячы на тое, што я ніякіх законаў у іх краіне не парушаў, увесь час тычкамі давалі мне зразумець, што я, на іх погляд, жудасны злачынца, ад якога яны ратуюць свой народ.

Літва. «Мы не чакалі вас...»

"Боінг-737" пайшоў на пасадку ў Вільні. Паліцэйскія высадзілі мяне з самалёта, а самі засталіся ў ім чакаць зваротнага рэйсу. Я ўвайшоў у тэрмінал і высветліў, што пра мяне там ніхто не чуў і не чакае. Літоўскія памежнікі былі здзіўлены, чаму беларуса дэпартавалі з Прагі ў Вільню, а не ў Мінск. І ніхто там не чуў пра тое Дублінскае пагадненне.

На маё шчасце, жанчына, якую адкамандзіравалі высвятляць маю сітуацыю, ва ўсім разабралася. Разам з тым і на тэрыторыю Літвы мяне ніхто не пускаў, бо, калі падчас здачы на чэшскі азыль літоўская віза ў мяне была яшчэ дзейснай, то на момант прылёту ў Вільню — ужо пратэрмінаванай. Калі б я папрасіў літоўскі азыль у тэрмінале аэрапорта, я б як нелегал мусіў бы адседзець да шасці месяцаў у ізалятары, перш як у маёй справе пачаліся б зрухі. Мне прапанавалі адпраўку назад, у краіну, з якой я прыляцеў у ЕС. Гэта значыць — ва Украіну. Стомлены ад лагера і няпэўнасці, пад пагрозай яшчэ шасці месяцаў ізалятара, я пагадзіўся. І назаўтра быў пасаджаны ў чарговы самалёт.

Пралятаючы над Беларуссю, вакол якой ужо зрабіў поўнае кола, я думаў, што яна, як магніт, прыцягвае сваіх сыноў, і, відаць, мне ніяк не пазбегнуць хуткай з ёй сустрэчы.

Ізноў Кіеў

19 сакавіка ў аэрапорце "Барыспаль" мяне сустрэлі кіеўскія сябры ды некаторыя беларусы, якія адседжваліся ў Кіеве напярэдадні Дня Волі. Мае расповеды іх шакіравалі. Тым больш што сітуацыя, у якой я апынуўся, стала вельмі падобнай да патавай. Праз тыдзень з Мінска пераехала жонка. Мы здолелі знайсці кватэру за 500 долараў, якую знялі да лета, у надзеі, што за гэты час з'явіцца праца ды нейкая перспектыва зноў трапіць у Чэхію. Але час працаваў не на нас.

Атрымаць паўторна чэшскую візу вельмі цяжка. Да таго ж ніхто так і не здолеў даць дакладнай кансультацыі, што будзе, калі я зноў прылячу ў Чэхію ды здамся там на азыль паўторна. Падпрацоўваючы ў Кіеве за невялічкія грошы, якіх хапае на аплату кватэры, з сумам бачым, як разам з апошнімі фінансамі таюць нашы надзеі на добры фінал гэтай гісторыі. Беларусь, а разам з ёй і турма з абрынутай вежай, становіцца ўсё бліжэйшай. Калі не геаграфічна, дык у часе вымушанага туды вяртання. І ўжо адседжаныя напрыканцы 90-х паўтара года здаюцца мне нязбыўнай марай у параўнанні з тэрмінам, які чакае пры вяртанні ў краіну...

Магчыма, шмат хто з эмігрантаў толькі пасмяяўся б з маёй гісторыі. Вось, маўляў, уцякач-небарака. Але камусьці, хто вырашыць пайсці гэтым шляхам, яна, верагодна, дапаможа. У тым ліку і прыняць рашэнне, ці варта ўвогуле пакідаць радзіму. Як я казаў на пачатку, да пэўнай думкі я так і не прыйшоў.

Аляксей ШЫДЛОЎСКІ.

Мінск—Масква—Кіеў—Прага—Вільня—Кіеў—...?

Аляксей Шыдлоўскі

Актывіст незарэгістраванага "Маладога фронту", пасля "Зубра", у 1997 г. упершыню трапіў у турму за палітычнае графіці, прайшоў праз сумнавядомы жодзінскі "Чорны бусел".

КОРАТКА

Арыштавана бухгалтарка, што крала грошы ў дзяцей і настаўнікаў

У Мінску арыштаваны былы галоўны бухгалтар упраўлення адукацыі Фрунзенскага раёна. Яе абвінавачваюць у крадзяжы ў асабліва буйным памеры з выкарыстаннем службовых паўнамоцтваў.

Паводле звестак праваахоўных органаў, жанчына дзейнічала ў складзе групы супрацоўнікаў данай бухгалтэрыі.

На працягу 2004—2007 гадоў яны штомесяц пералічвалі на свае рахункі ад 140 тысяч да 7 мільёнаў рублёў грошай, якія ўпраўленне адукацыі выдзяляла на заробкі настаўнікам, для дзіцячых садкоў, дзіцячых дамоў і прыёмных сем'яў.

Было падлічана, што ў агульным былы галоўны бухгалтар і яе памочнікі скралі больш за 314 мільёнаў рублёў.

Ад віртуальнай Леначкі пацярпелі тысячы беларусаў

Да непрадказальных наступстваў можа прывесці масіраваная атака на беларускія паштовыя серверы. Замаскіраваны пад прывітанне ад "Леначкі" вірус на мінулым тыдні некалькі дзён бесперашкодна трапляў на карпаратыўныя і прыватныя адрасы беларусаў.

Паводле самых сціплых падлікаў, на гэтую правакацыю з прапановай спампаваць пікантныя фота "тваёй Леначкі" паддаліся дзесяткі тысяч карыстальнікаў, уключаючы дзеячаў культуры, банкіраў і офісных працаўнікоў. Як паведамляе "Ежедневник", змест ліста быў наступны: "Прывітанне, памятаеш мяне? У архіве мае фоткі, як ты прасіў... (ідзе спасылка на архіў). Цалую, твая Леначка".

Практычна ў кожнай арганізацыі краіны, да якой даляцелі гэтыя пасланні, знайшоўся хаця б адзін чалавек, які захацеў паглядзець на гэтую таямнічую Леначку і адчыніў шлях для вірусу. Цяпер рассылка небяспечных лістоў заблакіраваная.

Аляхно прывёз у Белград больш за тону зефіру і цукерак

Больш за тону цукерак і зефіру прывёз на "Еўрабачанне-2008" прадстаўнік Беларусі на Міжнародным конкурсе песні Руслан Аляхно.

У яго промапакет акрамя салодкага ўвайшлі паліграфічная прадукцыя, дыск, асадка і сумка, паведамляе БЕЛТА.

13 мая ў Белградзе пройдзе першая рэпетыцыя беларускага выканаўцы, а 17-га — другая. Нагадаем, конкурс пачнецца 20 мая з паўфіналаў.

У гонар каралевы

Брытанскае пасольства ў Мінску з нагоды Дня нараджэння каралевы Вялікабрытаніі праводзіць мастацкі конкурс на тэму "Беларусь—Вялікабрытанія". Такая акцыя пройдзе ў Беларусі ўпершыню.

"Конкурс праходзіць да 30 мая 2008 года. Жыхарам рэспублікі ва ўзросце да 25 гадоў прапануецца стварыць малюнкі, скульптуры, літаграфіі, лагатыпы і іншае, якія б найбольш яскрава адлюстравалі сувязі паміж Беларуссю і Вялікабрытаніяй. Ацэнка вынікаў спаборніцтва будзе праводзіцца журы, у склад якога ўвайшла ў тым ліку і старшыня праўлення Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі Ніна Іванова", — паведамілі ў пасольстве.

Пераможцу будзе ўручаны прыз ад брытанскай дыпмісіі. Лепшыя творы будуць выстаўлены ў пасольстве Вялікабрытаніі.

ДЫПКУР'ЕР

У адзінаццаты раз...

У супрацоўнікаў пасольства Літвы ў Беларусі гэта стала ўжо добрай традыцыяй: напярэдадні Дня Перамогі прыязджаць у мемарыяльны комплекс "Хатынь" і ўскладаць кветкі да Вечнага агню. Сёлета літоўскія сябры наведалі святое для беларусаў месца на чале з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Эдмінасам БАГДОНАСАМ.

"Мы прыязджаем сюды ўжо адзінаццаты год запар, каб аддаць даніну памяці ахвярам хатынскай трагедыі і ўсім тым, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны, — сказаў Эдмінас Багдонас. — *У Літве таксама ёсць такія ж музеі і, думаю, што ў хуткім часе літоўскія і беларускія мемарыяльныя комплексы падпішуць дакумент аб супрацоўніцтве. Спадзяюся, што да такога супрацоўніцтва далучацца і іншыя краіны".*

Пасля ўскладання кветак, адказваючы на пытанні журналістаў аб ролі Літвы ў перамовах з Еўрасаюзам аб змякчэнні візавага рэжыму для Беларусі, пасол заявіў, што *"Літва не можа весці перамовы за Беларусь, мы можам толькі пасадзейнічаць гэтаму".*

Дарэчы, па словах Эдмінаса Багдонаса, зараз тавараабарот паміж Беларуссю і Літвой складае ўжо 1 мільярд 500 мільёнаў долараў.

"Прагрэс ёсць, і вынік заўсёды можна дасягнуць, калі імкнуцца да гэтага, — дадаў пасол. — *Гэта неабходна і для Беларусі, і для Літвы".*

Алесь СІВЫ.
Фота аўтара.

Народная Воля http://www.nv-online.info
15 МАЯ 2008 г.

Дома тряслись даже в Пекине

Число жертв землетрясения в китайской провинции Сычуань составляет тысячи человек. Тысячи получили ранения. В некоторых уездах провинции разрушены до 80% зданий, сообщает Euronews.

Эпицентр землетрясения находился в уезде Вэньчуань, в сотне километров к северо-западу от административного центра провинции, 10-миллионного города Чэнду.

Первые кадры, запечатлевшие землетрясение, пришли из Пекина, который находится в полутора тысячах километров от эпицентра. Жители китайской столицы рассказывали журналистам, что даже не самые высокие дома тряслись и раскачивались в течение двух минут.

Люди в испуге выбегали из домов, офисов и гостиниц. Землетрясение случилось в разгар рабочего дня. Многие до сих пор не хотят возвращаться в здания, опасаясь остаточных толчков. После главного удара в Сычуани уже последовали более сорока менее мощных.

Согласно поступающим данным, толчки в той или иной степени ощущались по всему Китаю, а также на Тайване, в Таиланде и Вьетнаме.

Во многих районах страны нарушено электроснабжение. Но китайские агентства особо отмечают, что крупнейшая в мире гидроэлектростанция "Три ущелья" не пострадала. Кроме того, подчеркивается, что олимпийские объекты в Пекине построены с учетом опасности землетрясений.

Европейский путь Сербии

На досрочных парламентских и местных выборах в Сербии, которые состоялись в воскресенье, победила коалиция проевропейских партий.

По предварительным результатам она набрала около 39% поддержки граждан. Ее главные соперники — сербские националисты из Радикальной партии — отстали на почти 10%. Этот результат гораздо хуже, чем на прошлых парламентских выборах полтора года назад. В парламент Сербии войдут еще три партии и представители национальных меньшинств, отмечает Радио Свобода.

Выборы в Сербии прошли в свободной и демократической атмосфере, серьезных нарушений процесса голосования не было, а самое важное — лидеры всех партий сразу признали предварительные результаты реальными и действительными.

Сразу после объявления первых результатов голосования лидер Демократической партии, президент Сербии **Борис Тадич** вышел перед журналистами с широкой улыбкой и решительно заявил:

"Спустя несколько месяцев после президентских выборов граждане Сербии без всяких сомнений снова подтвердили ясный европейский путь. Граждане Сербии заявили на этих выборах, что желают, чтобы страна была в составе Европейского Союза. И Сербия будет в составе Европейского Союза!"

Сербские политики перед выборами утверждали, что на этот раз голосование будет иметь характер референдума "за" или "против" Европы. В результате ситуация действительно разъяснилась в пользу европейской интеграции страны. Но этот путь будет непрост, отмечают СМИ. Абсолютного большинства в парламенте победители не получили. Борис Тадич, президент Сербии, отметил, что поскольку абсолютного большинства не получено, предстоят непростые коалиционные переговоры.

Состоявшиеся выборы в парламент Сербии показали, что голосование в очередной раз не объединило нацию, заявил председатель комитета Совета Федерации РФ по международным делам **Михаил Маргелов**. "Победа сторонников президента над радикалами не впечатляет — разрыв в полученных голосах мал", — напомнил в беседе с РИА "Новости". В связи с этим российский сенатор предположил, что действительную победу в итоге одержат те, кто более умело проведет переговоры внутри парламента.

Лужкову запретили въезд в Украину

Служба безопасности Украины (СБУ) запретила московскому мэру Юрию Лужкову въезд на территорию республики, сообщает "Интерфакс".

Таким образом украинские власти отреагировали на заявления мэра, сделанные во время празднования 225-летия Черноморского флота. По мнению СБУ, его высказывания наносят ущерб национальным интересам Украины и ее территориальной целостности.

В воскресенье Лужков заявил, что Севастополь в 1948 году получил статус государственного подчинения и поэтому в 1954 году он не мог быть передан Украинской ССР вместе со всем Крымом. Мэр пообещал официально обратиться к правительству России, в Госдуму и Совет Федерации, чтобы снова поставить вопрос по Севастополю. По мнению Лужкова судьбу Севастополя должен решать международный суд. Кроме того, Лужков заявил, что Россия должна выйти "из договора о дружбе между Россией и Украиной".

В Партии регионов Украины выразили надежду на то, что из уст представителей российского руководства не прозвучат заявления, провоцирующие конфликт между двумя странами.

Ручка Путина

С 8 мая Россией руководит тандем, образованный экс-президентом Владимиром Путиным, ставшим премьер-министром, и экс-вице-премьером Дмитрием Медведевым, ставшим президентом. Установление новой власти прошло с точностью швейцарских часов.

